**Варыянт 5**

**1. Адзначце словы, вымаўленне якіх не супадае з напісаннем:**
1) грузчык;
2) адрына;
3) ускіпець;
4) подзвіг;
5) магчыма.

**2. Адзначце словы, у якіх пішацца літара *а*:**
1) апл_чаны;
2) р_цэпт;
3) с_кратар;
4) выс_кагорны;
5) н_вароджаны.

**3. Адзначце словы, у якіх пішацца *мяккі знак*:**
1) песен_ка;
2) вішан_;
3) с_кінуць;
4) воз_ме;
5) маладзечан_кі.

**4. Адзначце радкі, у якіх усе словы аднакаранёвыя (роднасныя):**
1) мароз, марожанае, марзянка;
2) корань, караністы, караніцца;
3) падарожжа, падарожнічаць, спадарожны;
4) выспацца, выспа, выспаведаць;
5) дзяліць, дзяльба, дзялянка.

**5. Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок:**
1) каря_від;
2) мікра_раён;
3) паў_лыжкі;
4) Кміта_Чарнабыльскі;
5) вецер_сухавей.

**6. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 1-й асобы множнага ліку цяперашняга або будучага простага часу маюць канчатак *–ым (-ім)*:**
1) варажыць;
2) аддаляцца;
3) грукнуць;
4) выказаць;
5) запаволіць.

**7. Адзначце прыслоўі, якія трэба пісаць праз злучок:**
1) (на) заўтра;
2) ціха (ціха);
3) (на) бягу;
4) (абы) дзе;
5) (да) хаты.

**8. Адзначце словазлучэнні, у якіх *не* са словамі пішацца разам:**
1) весці сябе (не)спакойна;
2) (не)сказанае мною;
3) даўно (не)дачуваць;
4) (не)раней за цябе;

5) (не)уладкаванае жыццё.

**9. Адзначце словазлучэнні:**

1) глянуў увысь;
2) яснее небасхіл;
3) кніга прачытана;
4) ярка свеціць;
5) расцвілі пралескі.

**10. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў *неабходна* паставіць працяжнік:**

1) Раны гояцца часам, а дружбаю _ гора.
2) Анютка _ хоць сёння замуж выдавай.
3) Жыццё _ як казка.
4) Неба _ зорнае і глыбокае.
5) Сэрца _ не камень.

**11. Адзначце сказы, у якіх прапушчана коска (коскі):**

1) Бусел здаецца нам неад'емнай часткай беларускага сельскага пейзажу.
2) Слухалася Марына Васіля Пятровіча ва ўсім, хоць ён ёй ні сват ні брат.
3) Сёння Паўлюку ўдалося назбіраць смуглявых баравічкоў і жоўтых лісічак, і цыбатых падасінавікаў.
4) З самага ранку дзеці пускаліся або ў грыбную або ў ягадную вандроўку.
5) Бацькоўскі стол – гаспадар у хаце: ён сям'ю гуртуе ды гасцей частуе.

**12. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску (коскі):**

1) Холадна было б нам у зялёнай і мокрай пустыні _ ды ў нас ёсць вогнішча.
2) Сашы было не да гэтага хараства _ аднак і яна звярнула ўвагу на такі цуд прыроды.
3) Нізка стаяла асенняе сонца _ і нейкаю маркотаю патыхала ад усяго гэтага краявіду.
4) Міне колькі хвілін _ і задыміцца луг ад цёплых праталін.
5) Ні колас на ніве не скалыхнецца _ ні ліст на дрэве не зварухнецца.

**13. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы адасабляюцца:**

1) З *кранутых галавою* галінак сыпаўся іскрысты снег, белым воблакам курыўся за лыжнікам.
2) І была яна *гэтая сасна* самай прыгожай і высокай з усіх сваіх сясцёр.
3) Самалёт павярнуў назад і *зніжаючыся* пачаў набліжацца да возера.
4) Сіняватая смуга *поўная цеплыні і ласкі* песціла далёкія лясы і купчастыя бярозы, што адзінокімі постацямі абступалі старую дарогу.
5) Настаўнік *яшчэ зусім малады хлопец* ледзь-ледзь усміхнуўся сам сабе.

**14. Адзначце сказы, у якіх набраныя курсівам словы выдзяляюцца коскамі:**

1) Я *між іншым* была ў Празе ўпершыню.
2) Балюча мне, што лясныя вароты адчынены *на жаль* і брудным ботам.
3) Паспрабуй адказаць на пытанне *адным словам*.
4) У начным цемрыве вішня *здавалася* зусім побач, за самым балотам.
5) Я *напрыклад* прынцыпова ніколі не крытыкую сваіх прыяцеляў.

**15. Адзначце сказы,у якіх на месцы пропускаў ставіцца двукроп'е:**

1) Размыты цёплыя дарожкі_далёка ў лесе гром асеў.

2) Млын меле_мука будзе.
3) Стаяць я буду доўга каля жыта_яно ўмее душу лячыць.
4) Сніцца мне_сонца песціцца, ты, цішыня, дарога.
5) Пад акенцамі_гародчык_шмат анюціных у ім вочак.

**16. Адзначце схему, якой адпавядае сказ з простай мовай:**

Якое шчасце сказаў Іван мець сына, добрага, працавітага.

1) "П, – а. – П!"
2) "П, – а: – П!"
3) "П, – а, – п!"
4) "П!" – а.
5) "П, – а, – П!"

## Варыянт 2

**1. Адзначце словы, вымаўленне якіх не адпавядае напісанню:**
1) вучышся;
2) цвік;
3) скінуць;
4) лётчык;
5) гарадскі.

**2. Адзначце словы, у якіх пішацца літара *а*:**
1) пад_браны;
2) выс_кародны;
3) адр_с;
4) р_зультат;
5) д_мабудаўніцтва.

**3. Адзначце словы, у якіх пішацца *мяккі знак*:**
1) кудыс_ці;
2) надвор_е;
3) смаргон_скі;
4) ліпен_скі;
5) грабен_чык.

**4. Адзначце радкі, у якіх усе словы аднакаранёвыя (роднасныя):**
1) водар, вадзяны, водны;
2) лес, лесу, лесам;
3) бераг, узбярэжжа, прыбярэжны;
4) печ, прыпечак, пячны;
5) гаварыць, гаворка, гаварэнне.

**5. Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок:**
1) крэсла_ложак;
2) узаема_залежнасць;
3) Доўнар_Запольскі;
4) кіна_аматар;
5) шкло_пасуда.

**6. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 1-й асобы множнага ліку цяперашняга або будучага простага часу маюць канчатак *–ым (-ім)*:**
1) скасіць;
2) меркнуць;
3) расказаць;
4) гутарыць;
5) апранацца.

**7. Адзначце словазлучэнні з прыслоўямі, якія пішуцца праз злучок:**
1) уваходзіць (па)двое;
2) зрабіць (так) сяк;
3) падзяліць (па) роўну;

4) завыць (па) сабачы;
5) вырашыць (па) свойму.

**8. Адзначце словазлучэнні, у якіх *не* са словамі пішацца разам:**
1) (не) абсяжныя далі;
2) (не) па-твойму зроблена;
3) (не) прачытаная Віцем кніга;
4) (не) сустрэўшыся ні разу;
5) (не) дапісанае сачыненне.

**9. Адзначце словазлучэнні:**
1) расцвілі кветкі;
2) каля крамы;
3) добры настрой;
4) няхай расце;
5) пастаяць за сябе.

**10. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў *неабходна* паставіць працяжнік:**
1) Гэта не я гавару_гора маё гаварыць.
2) Вочы мае_сонныя.
3) Пісаць пра мінуласць_не крочыць назад.
4) Паэзія_як паветра, напоенае азонам.
5) Мінулае_падмурак будучыні.

**11. Адзначце сказы, у якіх прапушчана коска (коскі):**
1) Мы радаваліся сонцу і вясне і дажджу.
2) Мой край ты будзеш жыць!
3) Левы бераг нашай рэчкі нібы зялёны дыван.
4) Сынок скочыў у дзверы як апантаны.
5) Дзяўчына як ластаўка выпырхнула з двара.

**12. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску (коскі):**
1) Гаспадар на жытнёвым полі з каласамі_як з дзецьмі_гутарыў.
2) Мы ў майскі лес_нібыта ў рай_увайшлі.
3) На паляне_быццам на пасецы_пахла мёдам.
4) Вершаваны радок_нібы каласок, што выспеў у душы паэта.
5) Лёнька прыліп да дзеда_як смала_і не адыходзіў цэлы дзень.

**13. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы адасабляюцца:**
1) Дарога зусім не замерзла, толькі *запарушаная снегам* застыла, бы студзень.
2) Пан падлоўчы хадзіў *пераваньваючыся.*
3) Піліп *замест адказу* толькі рукамі развёў.
4) Беркут *ці горны арол* зранку насіўся ў паветры.
5) Пасля бяссоннай ночы і *не еўшы* працаваць было цяжка.

**14. Адзначце сказы, у якіх набраныя курсівам словы выдзяляюцца коскамі:**
1) Час *здавалася* спыніў свой ход, але першыя пробліскі святла напомнілі, што ўжо раніца.
2) Па ўсім было *відаць,* што сёння пойдзе дождж.

3) *На жаль* мы слаба ведаем сваю гісторыю, хоць яна мае амаль тысячагадовую даўнасць.

4) Дзе ж вы *хлопцы, дзяўчаты?* Чаму над ракой на Купалле агні не запалены?

5) Па-над рэчкай у лузе квяцістым мы хадзілі *таксама* не раз.

**15. Адзначце сказы,у якіх на месцы пропускаў ставіцца двукроп'е:**

1) Міналі дні_гады ў вырай злятaлі клінам жураўліным.

2) Я хустачку нацягваю на скроні_сыры вецер дзьмухнуў раптам вострым холадам.

3) Залаты быў час некалі_на заручыны дзяўчыны вышывалі каляровыя кілімы.

4) Не старэйце, людзі, дачасна_нараджайцеся, людзі, кожны дзень.

5) Зіма зажурыць_развяселіць лета.

**16. Адзначце схему, якой адпавядае сказ з простай мовай:**

*Гэта ж трэба, гэта ж трэба прыгаворвала жанчына як жа вы дапамаглі мне, дзеткі*

1) «П, – а: – П!»
2) «П! – а. – П!»
3) «П, – а, – П!»
4) «П. – а. – П!»
5) «П!» – а.